УДК 947.6

П.В. Дзядзюля, дацэнт

УТВАРЭННЕ БССР І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ

The article investigates the process of creating the national system of education by the government of the BSSR.

Памкненні свядомай часткі беларусаў да самастойнага існавання ў сваёй дзяржаве, да нацыянальнай адукацыі, нягледзячы на пастаяннае супраціўленне гэтаму працэсу польскіх і рускіх шавіністаў, зноў і зноў выяўляліся ў складаныя перыяды гісторыі.

Пачатак XX ст. і шэраг сацыяльна-палітычных катаклізмаў у свеце, Еўропе, распад тагачасных імперый абудзіў да нацыянальнага жыцця дзесяткі паднявольных народаў. Расійскія бальшавікі ўбачылі ў гэтай магутнай сацыяльнай сіле свайго саюзніка ў барацьбе з уладай царызму ў Расійскай імперыі.

У.І. Ленін, хутчэй з тактычных меркаванняў, абяцаў «усім народам, якія насялялі Расію, сапраўднае права на самавызначэнне» (Ленин В.И. // Полн. собр. соч. – Т. 35. – С. 11). А «Дэкларацыя праў народаў Расіі», прынятая пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, заканадаўча аформіла права выхаду народаў былой імперыі з агульнай дзяржавы. Гэта права выкарысталі Польшча, Фінляндыя, Латвія, Літва, Эстонія. Ідэі нацыяналізму аказаліся мацнейшымі, чым прывідны рай камуністычнай будучыні. Напалоханыя такім ходам падзей, бальшавіцкія правадыры зрабілі ўсё магчымае, каб спыніць развал ужо былой Расійскай імперыі і пачаць будаўніцтва новай, камуністычнай.

Былі падаўлены нацыянальна-дэмакратычныя рухі на Каўказе, Украіне, Беларусі, у Сярэдняй Азіі. Урад Беларускай Народнай Рэспублікі ва ўмовах нямецкай акупацыі, абапіраючыся на нешматлікую беларускую інтэлігенцыю, за кароткі час упершыню ў навейшай гісторыі аб'явіў беларускую мову дзяржаўнай, пачаў падрыхтоўку настаўнікаў для нацыянальных школ, у якіх масава з'явіліся падручнікі на яшчэ нядаўна занядбалай мове.

Драматызм падзей канца сусветнай вайны, перадзел дзяржаўных межаў у Еўропе, эгаізм суседзяў беларусаў перапынілі стваральную дзейнасць БНР. Але зробленае яе ўрадам ужо нельга было знішчыць, замаўчаць, праігнараваць. У канцы 1918 г. бальшавіцкі ўрад у Маскве вымушаны быў прызнаць права беларускага народа на самавызначэнне і нацыянальную дзяржаўнасць. 30-31 снежня 1918 г. 6-я Паўночна-Заходняя канферэнцыя РКП(б), якая адбылася ў Смаленску, абвясціла стварэнне БССР. Быў сфарміраваны Часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад Беларусі. Пэўная частка народа і асабліва прадстаўнікі левых партый віталі гэтую падзею, спадзеючыся на магчымасць будаваць свой беларускі дом.

Ілюзіі адносна самавызначэння ў хуткім часе рассеяліся. Ва ўрадзе БССР аказаліся ярыя антыбеларускія дзеячы начале з Мясніковым. Ніякіх захадаў па будаўніцтву беларускай культуры гэты ўрад не рабіў. Больш таго, маскоўскія ўлады вярнулі пад сваю юрысдыкцыю ўключаныя раней у склад БССР тэрыторыі Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Старшыня УЦВК Свярдлоў, які фактычна кіраваў работай Першага Усебеларускага з'езда Саветаў у Мінску 2-3 лютага 1919 г., патрабаваў аб'яднання Беларусі з савецкім урадам паўднёвай Літвы. У выніку была створана Літоўска-Беларуская савецкая рэспубліка. Фактычна БССР перастала існаваць.

У новаўтворанай рэспубліцы нічога беларускага не было. Школы, газеты, кнігі павінны былі карыстацца рускай, літоўскай, польскай мовамі, беларуская ж фактычна забаранялася.

У ходзе трагічнай для Беларусі савецка-польскай вайны было пастаўлена на парадак дня пытанне пра ўзнаўленне БССР. 31 ліпеня 1920 г. на сходзе кіруючых работнікаў кампартыі Літвы і Беларусі, мінскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, прадстаўнікоў партыйна-савецкіх органаў была прынята Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай ССР. Пасля Рыжскага мірнага дагавора 1921 г., паводле якога Заходняя Беларусь была перададзена Польшчы, БССР уключала ўсяго 6 паветаў Мінскай губерні. Нежыццяздольнасць абрэзанай, пакрыўджанай Беларусі была відавочнай. І Масква пасля настойлівых просьбаў партыйна-савецкага кіраўніцтва рэспублікі, падтрыманых большасцю яе насельніцтва, згадзілася на вяртанне Беларусі часткі яе ўсходніх тэрыторый. У 1924 г. былі вернуты паветы Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, а ў 1926 г. у склад БССР увайшлі Гомельскі і Рэчыцкі паветы.

Так званае «ўзбуйненне» Беларусі суправаджалася прыходам беларусаў да кіраўніцтва рознымі галінамі эканомікі, культуры рэспублікі. Паступова фарміравалася нацыянальная палітыка. Гэтаму садзейнічала і змена прыярытэтаў у геапалітыцы маскоўскіх улад. Разбуральная грамадзянская вайна, адным з лозунгаў якой быў «Даешь мировую революцию!», не толькі падняла на барацьбу супраць сусветнага капітала працоўных Еўропы, Азіі, але давяла народы савецкай краіны да галечы, голаду. У многіх рэгіёнах Савецкай Расіі, а таксама ў Беларусі пачаліся народныя хваляванні. У кіраўніцтве бальшавіцкай партыі наспела думка, што трэба ратаваць савецкую ўладу. X з'езд РКП(б) - сакавік 1921 г.- не толькі распрацаваў новую эканамічную палітыку, але прыняў рэзалюцыю «Аб чарговых задачах партыі ў нацыянальным пытанні», у якой указаў на вялікадзяржаўны шавінізм як галоўную небяспеку ў той час. Падкрэслівалася неабходнасць дабівацца даверу раней прыгнечаных нацый, развіваць на іх роднай мове органы ўлады, суды, курсы і школы як агульнаадукацыйнага, так і прафесіянальна-тэхнічнага напрамку, культурна-асветніцкія ўстановы, прэсу, тэатр (КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898-1986). – Т.2. 1917-1922. – М., 1983. – С. 366).

Своеасаблівая праграма маскоўскіх камуністаў па нацыянальнаму пытанню была ўспрынята з вялікай надзеяй. Тым больш, што яшчэ заставалася ў памяці пазіцыя Мяснікова, Кнорына і іншых па беларускаму пытанню, згодна з якой беларусы як нацыя не існавалі.

У Мінск, сталіцу БССР, пачалі вяртацца прыхільнікі камуністычнай ідэалогіі, вядомыя дзеячы нацыянальна-культурнага адраджэння – Чарвякоў А.Р., Жылуновіч Д.Ф., Пятровіч І.А. і іншыя. Гэта яны яшчэ ў лютым 1918 г. у Петраградзе стварылі Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам), які праводзіў культурна-асветніцкую работу, меў агітацыйна-палітычны, культурна-асветны, выдавецкі і іншыя аддзелы. Белнацкам заснаваў першую савецкую газету на беларускай мове «Дзянніца», выдаваліся таксама часопісы «Чырвоны шлях», «Беларуская крыніца», працы па гісторыі і культуры Беларусі, мастацкія творы, марксісцкая літаратура. За кароткі час выйшла 17 кніг, з якіх 10 – на беларускай мове (Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: НКФ «Экаперспектыва», 1996. – С. 196).

Кіруючыся рэзалюцыяй X з'езда РКП(б), кіраўніцтва БССР у кастрычніку-лістападзе 1921 г. правяло дыскусійныя сходы адказных работнікаў Мінскай партыйнай арганізацыі па беларускім пытанні. Вынікам гэтай дыскусіі сталі выпрацаваныя 13

тэзісаў пад агульнай назвай «Беларускае нацыянальнае пытанне і камуністычная партыя». Дакумент аб'ектыўна выкладаў нацыянальныя аспекты гістарычнага мінулага Беларусі. Падкрэслівалася, што разам «з палітыка-сацыяльным уціскам беларускія працоўныя масы падлягалі і нацыянальна-культурнаму прыгнёту. Ішла русіфікацыя краю, які з'яўляўся як бы калоніяй імперыі... Пануючы прыгнятальнік стараўся канчаткова адвязацца ад непрыемнай яму культуры, якая насіла ў сабе зародак і факты палітыка-сацыяльнага прагрэсу» (Известия Центрального Бюро Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии. – 1921. – 5 декабря. – С. 5).

У тэзісах ставілася задача неабмежаванага ўжывання беларускай мовы і развіцця беларускай нацыянальнай культуры.

Другі Усебеларускі з'езд Саветаў (1921 г.) выказаўся за пераход усіх дзяржаўных устаноў на беларускую мову. У лютым 1921 г. ЦВК БССР спецыяльным дэкрэтам замацаваў статус дзяржаўных за беларускай, яўрэйскай, польскай, рускай мовамі. А ў рэзалюцыі пленума ЦК КП(б)Б (студзень 1925 г.) адзначалася, што «пры раўнапраўі ўсіх нацыянальнасцей... справа развіцця мовы, літаратуры, школы, усёй культуры на беларускай мове прызнаецца першай і асноўнай працай» (ЭГБ. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1993. – Т. 1. – С.402).

На жаль, для эфектыўнай асветніцкай работы не хапала адпаведных спецыялістаў. Многія з іх у 1915– 1920 гг. пакінулі Бацькаўшчыну, некаторыя загінулі на франтах імперыялістычнай вайны, былі рэпрэсаваны бальшавіцкімі ўладамі. Доўгатэрміновыя і кароткатэрміновыя курсы для падрыхтоўкі настаўнікаў і работнікаў асветы не маглі адразу задаволіць патрэбы ў кадрах. ЦВК Беларусі ў 1921 г. звярнуўся з адозвай да ўсіх культурна-асветных работнікаў, ураджэнцаў Беларусі, раскіданых па ўсёй Расіі і іншых краінах, з заклікам вярнуцца на Радзіму для ўдзелу ў культурным будаўніцтве. У дакументе, у прыватнасці, быў і такі зварот: «Таварышы ўраджэнцы Беларусі: навукоўцы, літаратары, школьныя і дашкольныя работнікі, усе культурныя дзеячы! Ваша вызваленая бацькаўшчына кліча вас да сябе. Яна заклікае вас прыкласці сваю руку, узброеную веданнем савецкай культурнай працы, да яе адраджэння. Мы не абяцаем вам пакуль што больш выгадных умоў, чым у цэнтры, лепшых пайкоў і больш высокіх ставак. Магчыма, вам прыдзецца напачатку цярпець нястачы, невыгоды і нягоды, але працоўныя масы Беларусі, што рвуцца да святла, не забудуць тых, хто пажадаў зрабіцца ўдзельнікам у іхняй творчасці, дапамагчы ім выкаваць светлы вобраз новай культуры. Не бянтэжцеся таго, што некаторыя з вас недастаткова валодаюць беларускай мовай. Тут сярод беларускага сялянства вы прыгадаеце мову вашага маленства і авалодаеце ёю, калі ў вас будзе да таго жаданне» (Спадчына. – 1999. – № 3. – С. 11– 12).

У сувязі са зваротам СНК РСФСР прыняў спецыяльны дэкрэт, на аснове якога спецыялісты, выхадцы з Беларусі, адкамандзіроўваліся на Радзіму. Адпушчаны былі нават настаўнікі, якія знаходзіліся ў арміі і займалі пасады ніжэй ротнага камадзіра. Да канца 1921 г. каля 300 чалавек, сярод якіх былі беларусы, палякі, яўрэі, вярнуліся на Бацькаўшчыну для правядзення культурнай работы. З вялікай надзеяй на плённую дзейнасць па адбудаванню Беларускага Дома прыехалі з Адэсы і іншых гарадоў С.Некрашэвіч, М.Грамыка, М.Піятуховіч, Я.Лёсік. Савецкая ўлада дазволіла вярнуцца з эміграцыі А.Смолічу, М.Гарэцкаму, А.Цвікевічу, У.Пракулівічу, В.Ластоўскаму і іншым (Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: НФК «Экаперспектыва», 1996. – С. 198, 206).

Пачатак 20-х гадоў быў перыядам новых спадзяванняў беларусаў на заняцце свайго годнага месца сярод народаў. Упершыню ў навейшы перыяд гісторыі дзяржаўнае кіраўніцтва рэспублікі выпрацоўвае ўсебаковы план культурнага будаўніцтва і найважнейшым прыярытэтам лічыць развіццё мовы, літаратуры, школы, усёй культуры на беларускай мове. Ставіцца задача выпрацоўкі папулярнай мовы, найбольш блізкай да вёскі, апрацоўкі палітычнай, навуковай і юрыдычнай тэрміналогіі. Набываецца палепшаная выдавецкая тэхніка для пашырэння выданняў у першую чаргу на беларускай мове (Спадчына. – 1999. – № 3. – С. 18–19).

Беларуская інтэлігенцыя, якая паверыла ў шчырасць бальшавіцкага кіраўніцтва, апантанна працуе. Узнікаюць шматлікія выдавецтвы, дзе друкуюць падручнікі, мастацкую, навукова-тэхнічную літаратуру пераважна на беларускай мове. З дазволу Масквы кіраўніцтва БССР уступае ў гандлёвыя ,кантакты з Германіяй і размяшчае на яе паліграфічнай базе шматлікія заказы. Па ўсёй Беларусі адчыняюцца шматлікія пачатковыя, сямігадовыя школы. Настаўнікаў рыхтуюць педагагічныя тэхнікумы, універсітэт. Пры тагачаснай беднасці цэнтральныя, мясцовыя органы праяўляюць клопат аб памяшканнях для школ, кватэрах для настаўнікаў. Паўсюдна ствараюцца курсы беларусазнаўства, дзе жадаючыя, і ў першую чаргу настаўнікі, мелі б магчымасць павысіць веды па роднай мове, гісторыі.

Прага беларусаў усіх узростаў да ведаў вымушае дзяржаўныя органы арганізоўваць сістэму для работы з непісьменнымі і малапісьменнымі. Моладзь, якая не мае адпаведнай падрыхтоўкі для вучобы ў вышэйшых навучальных установах, ідзе вучыцца на рабфакі, дзе ўпартай працай набывае сярэднюю адукацыю. Вырашаецца задача беларусізацыі адукацыі. Ужо ў 1925-1926 навучальным годзе ў 4-гадовых школах выкладанне поўнасцю вялося на беларускай мове, у 7-гадовых – першыя тры гады таксама былі пераведзены на беларускую мову, апошнія класы – на 40 % (Чарвякоў А. За Савецкую Беларусь. – Мн.: Беларускае выдавецтва, 1927. – С. 137). Поўнасцю на беларускай мове ішло выхаванне ў дзіцячых дамах і садах.

У 1928 г. амаль 80 % школ было пераведзена на беларускую мову навучання. Разам з тым адчыняліся школы і класы з роднай мовай выкладання для прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей: яўрэйскай, польскай, украінскай, рускай і інш. У 1927 г. выкладанне ў школах Беларусі вялося на 8 нацыянальных мовах. Нацыянальных школ з 4-17-гадовым тэрмінам навучання налічвалася 4576, сярод іх 4203 беларускіх, 189 яўрэйскіх, 117 польскіх, 40 рускіх і інш. (Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў БССР. – Мн.: Выд-ва Нацкамісіі ЦВК БССР, 1928. Ч.1. Беларусізацыя. – С. 152).

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, недахоп памяшканняў і навуковага абсталявання, Беларускі дзяржаўны універсітэт толькі за першыя 5 гадоў свайго існавання падрыхтаваў 273 педагогаў, 130 юрыстаў, 125 эканамістаў і 170 медыкаў. На 1 кастрычніка 1927 г. ва універсітэце налічвалася 2622 студэнты. Выкладалі і вялі навуковую работу 49 прафесараў, 51 дацэнт, 74 асістэнты, 39 ардынатараў. Значна змянілася нацыянальная структура студэнтаў. Упершыню колькасць беларусаў перавысіла 50 % (54 %), яўрэяў было 37 %, рускіх – 5 %, палякаў – 1,5 %, іншых – 2 %. У 1927 г. пачалося будаўніцтва універсітэцкага гарадка, у якім праз некалькі гадоў і размясціўся ўвесь універсітэт (Спадчына. – 1999. – № 3. – С. 26).

Да разгрому беларускіх нацыянальных сіл універсітэт быў сапраўдным асяродкам нацыянальных кадраў, цэнтрам беларускай навуковай думкі.

Акрамя універсітэта працавалі Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія ў Горках, Віцебскі ветэрынарны інстытут і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы.

За кароткі час была створана досыць дасканалая сістэма сярэдніх спецыяльных устаноў. У 1926-1927 навучальным годзе ў БССР працавала 14 педагагічных тэхнікумаў, 2 транспартныя, 8 сельскагаспадарчых, 2 дарожнабудаўнічыя, 1 элетрамеханічны, 1 музычны, 1 мастацкі і 2 медыцынскія тэхнікумы, а таксама шматлікія прафесійныя школы і школы фабрычна-заводскага навучання, у якіх выкладанне ў 1928 г. было пераведзена на беларускую мову (Спадчына. – 1999. – № 3. – С. 30).

Беларусізацыя ўсіх форм адукацыі, справаводства стварыла моцны падмурак для развіцця нацыянальнай культуры. Праз беларусізацыю справа культурнага адраджэння стала народнай справай. Народ прыняў яе і пачаў пасылаць на вучобу ўсё больш і больш маладых людзей, многія з якіх прыйшлі ў літаратуру, навуку, мастацтва, вытворчасць.

Як пасля зімніх маразоў вясна прыносіць абуджэнне прыроды, так і дзейнасць нацыянальных сіл БССР у 20-я гады прывяла да росквіту талентаў беларусаў. Ворагі Беларусі толькі чакалі моманту, каб перапыніць гэты жыццядзейны працэс. Услед за разгортваннем новай эканамічнай палітыкі крута мяняліся адносіны да нацыянальнага адраджэння і асноўнай яго рухаючай сілы – інтэлігенцыі. Быў аб'яўлены варожым народу нацыянал-дэмакратызм, які яшчэ Ленін лічыў справай прагрэсіўнай. У 1929 г. Масква пасылае ў Беларусь партыйную камісію. Яна нібыта вывучала становішча ў нацыянальна-культурным будаўніцтве Беларусі. Дзейнасць гэтай камісіі жахлівая для лёсу беларускай інтэлігенцыі. Яна сведчыла аб пачатку нацыянальнай трагедыі. 3 студзеня 1930 г. быў прысланы ў Мінск сакратаром ЦК партыі нейкі Гей, а кіраўніком ДПУ Рапапорт. І адразу ж была сфабрыкавана справа «Саюз вызвалення Беларусі». Вясной-летам 1930 г. на справе СВБ было арыштавана 108 чалавек. Сярод іх найбольш работнікаў асветы, навукоўцаў, дзеячаў культуры, пісьменнікаў. 78 чалавек атрымала па 5 гадоў ссылкі, 7 - па 5 гадоў і адзін – 3 гады канцлагераў (Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: НФК «Экаперспектыва», 1996. – С. 210).

Паступова складвалася дзіўная сітуацыя, якая да гэтага часу ў поўнай меры не асэнсавалася грамадзянамі Беларусі і найперш вучонымі, палітыкамі. Метадычна знішчаліся партыйныя, савецкія, прафсаюзныя работнікі, вучоныя, пісьменнікі, выкладчыкі, журналісты, рабочыя, сяляне, студэнты. Большасці з іх прыклейвалі жахлівыя ярлыкі – нацыянал-фашыст, забойца, вораг народа. І ў той жа час стваралася разгалінаваная сістэма адукацыі, адчыняліся новыя школы ўсіх узроўняў, для іх рыхтаваліся кадры. Друкаваліся новыя падручнікі, але адначасова выкідваліся старыя.

Такім няпростым і супярэчлівым быў шлях беларускай нацыянальнай культуры. Адпаведна супярэчлівай была і яе роля ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці.